*Прынёманне* — край, прырода каля ракі Нёман.



## ВІКТАР ШЫМУК

### Канікулы

Ля рэчкі —
Росныя сцяжынкі,
Сцяжынкі —
У казачным бары.
У паходзе хлопчыкі,
Дзяўчынкі,
У паходзе
Школьныя сябры.

Яны ідуць па родным
Краі,
Яны Прынёманнем
Ідуць,
Бярозкі іх
Здалёк вітаюць,
Ім песні жаўрукі
Пяюць.

О любы край,
Ты днём і ўночы
Такі прыгожы,
Дарагі,





Правообладатель Национальный институт образования

Як хораша
Палямі крочыць,
Пазнаць
Сцяжынкі і шляхі.

Пабыць у пушчах
Ля зямлянак,
Што параслі
Даўно травой,
Дзе мужна
Нашы партызаны
Ішлі на ворагаў
У бой.

Пабыць ля Нёмана
І Буга,
Пабыць ля Сожа
І Дняпра,
Прайсціся полем,
Лесам, лугам
І песні пець
Каля кастра...



1. Чаму школьныя сябры адправіліся ў паход па родным краі? Падмацуйце сваю думку радкамі з верша.
2. Дзе героі твора падарожнічалі? Што іх цікавіць? Як гэта характарызуе юных вандроўнікаў?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Па чым можна здагадацца, што вучні падарожнічаюць па ўсёй нашай краіне? Дакажыце адпаведнымі радкамі з верша.
4. Як сама прырода адносіцца да падарожнікаў? Прачытайце адпаведныя словы.
5. Якое слова дапамагае ўявіць бярозкі як жывых істот?
6. Вызначце асноўную думку верша.
7. Разгледзьце ілюстрацыі да верша. Ці адпавядаюць яны зместу твора? Чаму? Абмяркуйце, якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да твора.
8. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Як вы плануеце адпачываць летам? Ці былі вы ўдзельнікамі паходаў па родным краі? Калі, з кім і дзе вы падарожнічалі?

***Акцябро́нак*** — вучань 2, 3 або 4-га класа, які рыхтуецца стаць піянерам.
***Ко́ўдраў ска́тка*** — коўдры, скручаныя ў трубку і звязаныя па канцах для нашэння праз плячо.
***Му́ляць*** — цiснуць, націраць.
***Ко́лікі*** — рэзкі, востры боль у жываце або ў баку.
***Вярста́*** — старая мера даўжыні, роўная 1 км 60 м.



Правообладатель Национальный институт образования

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

# Сябры ў паходзе



Як выходзілі сябры
У дарогу на зары,
Бралі яны рэчы,
Клалі іх за плечы:

Грышка ўзяў палатку,
Цішка — коўдраў скатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Толькі выйшлі за сяло
Цішку муляць пачало,
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
Стась — тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.



Правообладатель Национальный институт образования



І гадзіну не ішлі —
Стася колікі ўзялі.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
Харч і посуд — Лёўка,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.

Як мінулі вёрстаў пяць,
Стала моцна прыпякаць.
Просіць Лёўка Грышку:
— Памажы, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клу́нак Лёўкаў,
А сачкі з бляшанкай —
Акцябронак Янка.



Правообладатель Национальный институт образования

За гарой, дзе бор драмаў,
Раптам Янка закульгаў.
Стаў прасіць ён Грышку:
— Паднясі, брат, крышку!

Цягне Грышка скатку,
Скатку і палатку,
І тапор з рыдлёўкай,
І ўвесь клунак Лёўкаў,
І сачкі, й бляшанку,
І... самога Янку!

1. Якія пачуцці выклікаў у вас Грышка? Чаму?
2. Ці можна назваць Грышку, Цішку, Стася, Лёўку і Янку сапраўднымі турыстамі?
3. Чаму ва ўсіх дзяцей, акрамя Грышкі, не хапіла фізічных сіл несці неабходныя рэчы?
4. Разгледзьце ілюстрацыі да верша (с. 111, 112). Вызначце, дзе на іх акцябронак Янка, а дзе — Грышка. Прачытайце радкі, якія адносяцца да ілюстрацыі.
5. Для чаго паэт расказаў гэту смешную гісторыю?
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора, перадаючы́ яго жартоўны настрой.

**Давайце абмяркуем.** Як вы разумееце выраз «быць сапраўдным турыстам»? З якой мэтай людзі займаюцца турызмам?



Правообладатель Национальный институт образования